Несмотря на указанные замечания, очевидным является в целом соответствие авторского проекта Оперативно-розыскного кодекса Российской Федерации, предлагаемого В.Ф. Луговиком, современному уровню развития российского законодательства, предполагающему стремление к реальному обеспечению прав лиц, вовлеченных в правоотношения.

**Библиографический список**


1. Луговик, В. Ф. Оперативно-розыскной кодекс Российской Федерации: авторский проект / В. Ф. Луговик. – Омск : Омская юридическая академия, 2014. – 96 с.
2. Макарова, З. В. Презумпция невиновности: прошлое и настоящее. – Режим доступа: http://www.iuaj.net/node/434. – Дата доступа: 12.04.2016.
3. Шейфер, С. А. Доказательства и доказывание по уголовным делам: проблемы теории и правового регулирования : монография / С. А. Шейфер. – 2-е изд.. испр. и доп. – М. : Норма, 2014. – 240 с.
4. Уголовно-процессуальное право Российской Федерации : учебник / отв. ред. П. А. Лупинская. – М. : Юристъ, 2003. – 797 с.
5. Арепьева, Т. А. Начальник подразделения дознания в российском уголовном процессе : автореф. дис. … канд. юрид. наук : 12.00.09 / Т. А. Арепьева. – М., 2013. – 28 с.
6. Насонова, И. А. К вопросу о понятии начальника подразделения дознания в российском уголовном процессе / Т. А. Степанова, И. А. Насонова // Научный портал МВД России. – 2012. – № 4(20). – С. 7–11.
7. Насонова, И. А. Полномочия начальника подразделения дознания в российском уголовном процессе: понятие и классификация / И. А. Насонова, Т. А. Степанова // Вестник Воронежского института МВД России. – 2012. – № 2. – С. 111–114.



**УДК 347.82.001**



***Л. А. Рабцава***
***L. A. Ryabtseva***
*Магілёўскі інстытут МУС (Беларусь)*


# АСАБЛІВАСЦІ АЖЫЦЦЯЎЛЕННЯ ПАВЕТРАНЫХ ПЕРАВОЗАК АСОБНЫХ КАТЭГОРЫЙ ПАСАЖЫРАЎ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

# FEATURES OF AIR OPERATIONS OF CERTAIN CATEGORIES OF PASSENGERS IN THE REPUBLIC OF BELARUS


***Анатацыя.*** *У артыкуле выкладзены заканадаўча замацаваныя агульныя правілы ажыццяўлення паветраных перавозак непаўналетніх грамадзян, недзеяздольных асоб, грамадзян, стан здароўя якіх мае свае асаблівасці. Унесена прапанова дапоўніць нарматыўныя прававыя крыніцы Рэспублікі Беларусь у сферы*

*паветраных пасажырскіх зносін дадатковым палажэннем аб паветранай перавозцы яшчэ адной катэгорыі пасажыраў.*

***Summary.*** *The article describes the legislated general rules for air operations of minors, incapacitated persons, citizens, the health of which has its own characteristics. A proposal to supplement the regulatory and legal sources of the Republic of Belarus in the field of air passenger transport additional regulation on air carriage of another category of passengers.*

***Ключавыя словы:*** *паветраная перавозка пасажыраў, суправаджэнне, перавозчык, паветранае судна.*

***Keywords:*** *air transportation of passengers, maintenance, carrier, aircraft.*

Разнастайнасць гаспадарча-эканамічнага жыцця дзяржаў вядзе да развіцця міжнародных перавозак, у прыватнасці міжнародных паветраных перавозак, значным плюсам якіх з’яўляецца высокая хуткасць. Паветраны транспарт забяспечвае развіццё патокаў інтэграцыі, пашырэнне гандлю, эканамічна эфектыўнае распаўсюджанне тавараў і паслуг.

Асаблівую важнасць паветраны транспарт набывае для пасажырскіх міжнародных зносін. У апошнія гады яны дынамічна развіваюцца, а іх прававое рэгуляванне значна абнавілася, што не застаецца без увагі беларускага заканадаўцы і знаходзіць сваё адлюстраванне ў адпаведных нарматыўных прававых актах краіны.

Мэтай дадзенага даследавання з’яўляецца правядзенне аналізу існуючай заканадаўчай базы Рэспублікі Беларусь у галіне паветраных пасажырскіх зносін у дачыненні да сацыяльна ўразлівых груп насельніцтва – непаўналетніх, інвалідаў, хворых, недзеяздольных асоб, цяжарных жанчын.

Артыкул 1 Паветранага кодэкса Рэспублікі Беларусь ад 16 мая 2006 года № 117-З (у рэд. ад 10.01.2015 г. № 242-З) вызначае паветраную перавозку як перавозку паветранымі судамі пасажыраў, багажу, грузаў і паштовых адпраўленняў [1, арт. 1]. Яе рэгламентацыя знаходзіць сваё адлюстраванне ў пастанове Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь ад 12.08.2009 № 70 «Авіяцыйныя правілы паветраных перавозак пасажыраў, багажу, грузаў», якія распрацаваны ў адпаведнасці з крыніцамі міжнароднага паветранага права: Канвенцыяй аб міжнароднай грамадзянскай авіяцыі (Чыкага, 1944 г.), Канвенцыяй для ўніфікацыі некаторых правілаў, якія датычацца міжнародных паветраных перавозак (Варшава, 1929 г.), Пратаколам аб папраўцы да Канвенцыі для ўніфікацыі некаторых правілаў, якія датычацца міжнародных паветраных перавозак, якая была падпісана ў Варшаве 12 кастрычніка 1929 года (Гаага, 1955 г.), Стандартамі і Рэкамендаванай практыкай Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (ІКАО).

У сувязі з тым, што Рэспубліка Беларусь імкнецца аказваць дапамогу і забяспечваць усемагчымыя гарантыі і ахову найбольш безабароннай і ўразлівай катэгорыі насельніцтва – інвалідаў, хворых, дзяцей – глава 10 раздзела IV «Авіяцыйных правілаў паветраных перавозак пасажыраў, багажу, грузаў» (далей – Авіяцыяныя правілы) заканадаўча замацоўвае перавозку наступных груп пасажыраў:

1) непаўналетніх грамадзян Рэспублікі Беларусь;

2) грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія ў судовым парадку прызнаны недзеяздольнымі;

3) пасажыраў, стан здароўя якіх мае свае асаблівасці.

Паветраная перавозка кожнай з гэтых груп пасажыраў паветранага судна мае свае ўласцівыя рысы, што ўлічваецца заканаўдаўцам і знаходзіць сваё замацаванне ў Авіяцыйных правілах.

Так, непаўналетні грамадзянін Рэспублікі Беларусь надзелены правам на выезд за межы Рэспублікі Беларусь сумесна хаця б з адным з бацькоў, усынавіцеляў, апекуноў ці папячыцеляў. У выпадку, калі непаўналетняму грамадзяніну Рэспублікі Беларусь не забяспечваецца суправаджэнне, ён павінен мець пры сабе не толькі пашпарт, але і натарыяльна аформленую згоду яго законных прадстаўнікоў на выезд непаўналетняга грамадзяніна за межы краіны з указаннем тэрміну выезду і дзяржавы (дзяржаў), якую (якія) ён намерваецца наведаць.

Пры гэтым адказнасць за афармленне і наяўнасць у непаўналетняга грамадзяніна Рэспублікі Беларусь патрэбных дакументаў нясуць яго бацькі, усынавіцелі, апекуны, папячыцелі.

Узрост дзіцяці мае першаступеннае значэнне і ўлічваецца на дату пачатку перавозкі ад аэрапорта (пункта) адпраўлення, пазначанага ў перавозачным дакуменце.

Неабходнай умовай перавозкі дзяцей, якія не дасягнулі 5-цігадовага ўзросту, з'яўляецца наяўнасць пры іх паўналетняга пасажыра-суправаджальніка.

Патрабаванні да перавозкі дзяцей ва ўзросце ад 5 (пяці) да 12 (дванаццаці) год не з'яўляюцца такімі катэгарычнымі з прычыны таго, што адсутнасць суправаджэння непаўналетніх дзяцей дарослым пасажырам становіцца магчымай са згоды перавозчыка пасля афармлення бацькамі, усынавіцелямі, апекунамі або папячыцелямі ў адпаведнасці з правіламі перавозчыка пісьмовай заявы на перавозку дзіцяці, якое не суправаджаецца.

Дзеці, якія дасягнулі 12-цігадовага ўзросту, могуць перавозіцца без суправаджэння паўналетняга пасажыра. Па просьбе бацькоў, усынавіцеляў, апекуноў ці папячыцеляў перавозка пад назіраннем

перавозчыка можа распаўсюджвацца на дзяцей ва ўзросце да 16 (шаснаццаці) год.

Перавозка непаўналетніх грамадзян без суправаджальнікаў ажыццяўляецца прамымі рэйсамі перавозчыка да пункта назначэння і па магчымасці ў дзённы час. Пры адсутнасці прамога рэйса перавозчыка да пункта назначэння перавозка дзіцяці, якое не суправаджаецца, з'яўляецца дапушчальнай пры ўмове наяўнасці ў яго білета з пацверджаным браніраваннем на ўсіх участках маршрута і з улікам патрабаванняў ці правілаў дзяржавы трансферу (транзіту).

Аплата перавозкі непаўналетняй асобы без паўналетняга суправаджальніка, ажыццяўляецца згодна з правіламі перавозчыка, якія публікуюцца ў міжнародных сістэмах браніравання ў адпаведнасці з рэкамендацыямі Міжнароднай асацыяцыі паветранага транспарту (IATA).

Адно дзіця ва ўзросце да 2 (двух) год перавозіцца ў суправаджэнні паўналетняга пасажыра пры выкананні ўнутраных паветраных перавозак бясплатна, а пры ажыццяўленні міжнародных паветраных перавозак – са зніжкай у памеры дзевяноста працэнтаў ад нармальнага або спецыяльнага тарыфу, калі адсутнічаюць асобыя ўмовы прымянення спецыяльнага тарыфу, і без прадастаўлення дзіцяці асобнага месца [1, ч. 5 арт. 99]. Калі для дзіцяці ва ўзросце да двух год па просьбе асобы, якая яго суправаджае, выдзяляецца асобнае месца, то такі непаўналетні перавозіцца па дзіцячым тарыфе, які ўстанаўліваецца перавозчыкам у адпаведнасці з рэкамендацыямі IATA.

Кожнае наступнае дзіця ва ўзросце да 2 (двух) год, якое перавозіцца ў суправаджэнні дарослага пасажыра, а таксама дзеці ва ўзросце ад 2 (двух) да 12 (дванаццаці) год пры перавозцы карыстаюцца дзіцячым тарыфам, які перавозчык устанаўлівае ў адпаведнасці з рэкамендацыямі IATA, з прадастаўленнем асобных месцаў для гэтай катэгорыі непаўналетніх [2, п. 133].

У выпадку, калі пасля пачатку перавозкі асоба, якая суправаджае дзіцяці, дабравольна ці вымушана змяняе дагавор паветранай перавозкі, білет непаўналетняга пасажыра пераафармляецца (абменьваецца) па тарыфе, які будзе адпавядаць узросту дзіцяці на дату пачатку перавозкі ад аэрапорта (пункта) адпраўлення.

Кожны пасажыр самастойна вызначае магчымасць карыстання паветраным транспартам, зыходзячы са стану свайго здароўя. Аднак дзяржава таксама клапоціцца аб умовах пералёту паветраным суднам хворых і людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасці.

Пункты 137–143 «Авіяцыйных правілаў паветраных перавозак пасажыраў, багажу, грузаў» акрэсліваюць дапушчальныя варыянты паветраных перавозак такіх асоб.

Так, пасажыр у крэсле-калясцы, які не можа перамяшчацца самастойна, або хворы на насілках прымаюцца да перавозкі ў суправаджэнні асобы, здольнай забяспечыць догляд за гэтым пасажырам у палёце. Перавозку такіх пасажыраў магчыма праводзіць і пад назіраннем перавозчыка, калі гэта прадугледжваецца правіламі перавозчыка.

Хвораму на насілках прадастаўляюцца дадатковыя месцы з аплатай, якая ўстаноўлена перавозчыкам.

Пры гэтым перавозчык карыстаецца правам адмовіць у перавозцы такому хвораму праз адсутнасць на паветраным судне неабходных умоў для ажыццяўлення перавозкі асоб дадзенай катэгорыі.

Свае ўласцівасці мае перавозка пасажыра, пазбаўленага зроку і (або) слыху. Гэтая асоба можа быць дапушчана да паветранай перавозкі як з суправаджальнікам, так і без яго (пад назіраннем перавозчыка, калі такая перавозка не супярэчыць яго правілам), а таксама ў суправаджэнні сабакі-павадыра (па ўзгадненні з перавозчыкам).

Калі пасажыр, пазбаўлены зроку і (або) слыху, карыстаецца суправаджэннем сабакі-павадыра, то такі пасажыр павінен прад’явіць перавозчыку наступныя дакументы: а) дакумент, які пацвярджае яго інваліднасць, б) дакумент, які пацвярджае спецыяльнае навучанне сабакі-павадыра.

Перавозка сабакі-павадыра, які суправаджае пасажыра, пазбаўленага зроку і (або) слыху, з’яўляецца бясплатнай звыш устаноўленай нормы бясплатнага правозу багажу. Пры гэтым сабака-павадыр павінен мець ашыйнік і наморднік і быць прывязаным да крэсла ля ног пасажыра, які мае патрэбу ў суправаджэнні [2, п. 140].

Асоба без суправаджальніка, пазбаўленая зроку і (або) слыху, можа быць прынята да перавозкі пад назіраннем перавозчыка па ўзгадненні з апошнім і пасля афармлення ў адпаведнасці з правіламі перавозчыка пісьмовай заявы на перавозку пад яго назіраннем.

Абавязковаму ўзгадненню з перавозчыкам (калі такая перавозка прадугледжана правіламі перавозчыка) падлягае перавозка паветраным транспартам па хадайніцтве бацькоў, усынавіцеляў або апекуноў недзеяздольнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, нягледзячы на тое, што такі пасажыр будзе падчас перавозкі знаходзіцца на паветраным судне ў суправаджэнні паўналетняй асобы, здольнай зрабіць бяспечным пералёт недзеяздольнай асобы і захаваць бяспеку астатніх людзей у час палёту.

Аналізуючы існуючыя правілы паветранай перавозкі, неабходна адзначыць, што пералік катэгорый пасажыраў, якія патрабуюць да сябе пільнай увагі пры перавозцы, замацаваны ў заканадаўчай базе Рэспублікі Беларусь у галіне ажыццяўлення пасажырскіх паветраных зносін, не з'яўляецца вычарпальным і патрабуе пэўнага ўдакладнення.

Нарматыўнымі прававымі крыніцамі Рэспублікі Беларусь, якія рэгулююць паветраныя перавозкі асобных катэгорый грамадзян, не ўлічана такая група асоб, як цяжарныя жанчыны, стан якіх з'яўляецца фізіялагічна натуральным, аднак патрабуе звярнуць на сябе ўвагу з прычыны таго, што пералёт – стрэсавая сітуацыя для кожнага чалавека, а арганізм цяжарнай жанчыны і без таго адчувае перагрузку.

Таму аўтар лічыць мэтазгодным у главу 10 раздзела IV Авіяцыйных правілаў уключыць дадатковае палажэнне, якое будзе датычыцца перавозкі на паветраных судах цяжарных жанчын з тэрмінам цяжарнасці звыш 28 тыдняў, у наступнай магчымай рэдакцыі: «Цяжарныя жанчыны прымаюцца да перавозкі пры прадастаўленні імі авіякампаніі медыцынскага заключэння ад медыцынскай арганізацыі аб адсутнасці супрацьпаказанняў да паветранай перавозкі на дату выканання рэйса, пазначанага ў білеце» (менавіта ў такой фармулёўцы існуе дадзенае правіла ў заканадаўстве краіны-партнёра, удзельніцы Садружнасці Незалежных Дзяржаў – Рэспублікі Казахстан) [3, п. 33]. З гэтай прычыны варта звярнуцца да станоўчага пераймання вопыту адзначанай дзяржавы, замацоўваючы тым самым належную прававую ахову цяжарных жанчын Рэспублікі Беларусь на барту паветраных суднаў.

**Бібліяграфічны спіс**

1. Паветраны кодэкс Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс] : 16 мая 2006 г., № 117-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 3 крас. 2006 г. : адобраны Саветам Рэсп. 24 крас. 2006 г. : у рэд. Закона Рэсп. Беларусь ад 10.01.2015 г. № 242-З // КансультантПлюс. Беларусь / ТАА «ЮрСпектр», Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2016.

2. Аб зацвярджэнне авіяцыйных правілаў паветраных перавозак пасажыраў, багажу, грузаў [Электронны рэсурс] : пастанова Міністэрства транспарту і камунікацый Рэсп. Беларусь, 12 жніўня 2009 г., № 70 : у рэд. пастановы Міністэрства транспарту і камунікацый Рэсп. Беларусь ад 16 чэрвеня 2014 г. // КансультантПлюс. Беларусь / ТАА «ЮрСпектр», Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь. – Мінск, 2016.

3. Аб зацвярджэнні правілаў перавозак пасажыраў, багажу і грузаў на паветраным транспарце [Электронны рэсурс] : пастанова Урада Рэсп. Казахстан, 13 снеж. 2011 г., № 1522 : са змян. і дап. 15.02.2013 г. // Заканадаўства Рэспублікі Казахстан: інфармацыйны партал. – 2016. – Рэжым доступу: http://online.zakon.kz/Document/?doc_id=31098831#pos=4;-323. – Дата доступу: 29.05.2016.